# Дарогі Уладзіміра Садзіна

**У галоўным мастацкім музеі краіны ў гэтыя выхадныя яшчэ можна ўбачыць выстаўку Уладзіміра Садзіна, прысвечаную падарожжам. У складзе савецкіх дэлегацый мастак пабываў у 14 краінах, у тым ліку ў ЗША, Канадзе, Японіі, Індыі. Экспазіцыю складаюць больш за 50 графічных работ, а таксама сувеніры, якія творца прывозіў сябрам, кнігі, асабістыя рэчы вандроўніка. Прадстаўленыя графічныя аркушы створаны ў 1970-х — пачатку 1990-х гг. і практычна не вядомы шырокаму колу гледачоў.**

Уладзімір Садзін (1924-2010) — мастак, педагог, заслужаны работнік культуры БССР, член Беларускага саюза мастакоў. Нарадзіўся ў 1924 годзе ў Расіі ў Пензенскай вобласці. Ужо ў школьныя гады прымаў удзел у конкурсах, якія праводзіліся газетамі «Колхозные ребята», «Пионерская правда», адсылаў малюнкі ва Усесаюзны Дом эстэтычнага выхавання дзяцей. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ён і на фронце працаваў над пейзажамі, партрэтамі, карыкатурамі. Між тым быў удзельнікам вызвалення Беларусі, Украіны, штурмаваў Кёнігсберг і Пілау. Пасля вайны жыў у Слуцку, дзе заснаваў студыю навучання дзяцей графіцы. Сярод яго выхаванцаў — Уладзімір і Міхаіл Басалыга, Георгій Скрыпнічэнка, Уладзімір Голуб, Уладзімір Акулаў. Быў ганаровым грамадзянінам Слуцкага раёна. Слуцкая мастацкая галерэя носіць яго імя.



*«Плошча Філадэльфіі», 1987 г.*

У 1953 годзе Уладзімір Садзін скончыў Маскоўскі народны ўніверсітэт мастацтваў. На працягу ўсяго жыцця актыўна працаваў і падарожнічаў, стварыў больш за тысячу твораў, браў удзел у розных рэспубліканскіх і замежных выстаўках. Многія з яго работ знаходзяцца ў прыватных калекцыях і ў музеях Беларусі, ЗША, В'етнама, Расіі, Казахстана, Японіі, Германіі, Англіі, Ірландыі і іншых краін.

Дарэчы, тэма для асобнай размовы — падарожныя нататкі аўтара. Вось некалькі вытрымак з іх. Пра Нью-Ёрк 1986 года: «Дарогі Амерыкі! Гладкі роўны бетон, 8-10-палосны рух! Суцэльны паток машын, віражы і спіралі стужак асфальту. Яркая жоўтая і чырвоная палітра восені. У туманнай смузе, удалечыні замаячылі сілуэты хмарачосаў. <...> Тунэлі, рака Гудзон, масты… і вось мы заехалі ў самы высокі горад планеты…» Пра Сент-Пітэрсберг (1986): «Наведванне школы, дзе вучацца дзеці з 1-га да 4-га класа. Некаторыя дзеці баяліся. Яны наслухаліся пра КДБ, думалі, што мы будзем апрануты ўсе ў чырвонае і з чорнымі паясамі». Пра Дэлі ў 1981-м: «І ўсюды — гандаль. Гандлююць усім, чым толькі можна гандляваць, зазываюць у свае крамы; крыкі, гудкі машын, рыпенне тармазоў, спецыфічны пах, яркае адзенне людзей, старыя храмы — усё гэта непаўторна і, мабыць, можна ўбачыць толькі ў Індыі».



*«Кёльн. У музеі сучаснага мастацтва», 1974 г.*

Гарадскія пейзажы, і сёння не надта вядомыя жыхарам Беларусі, помнікі архітэктуры, якія далёка не кожны мог пабачыць на свае вочы, сюжэты, у якіх застыў час, — змест выстаўкі ў Мастацкім. Глядач бачыць бяздомных у Лафает-парку Вашынгтона, назірае за манашкамі ў музеі Штутгарта, разглядае напоўненую людзьмі і аўтамабілямі вуліцу ў Мюнхене… Нягледзячы на тое, што шмат увагі забіраюць пейзажы Кёльна, Парыжа, Італіі, Японіі, не застаюцца незаўважанымі больш сціплыя выявы, напрыклад, Егіпта («Набярэжная ў Александрыі», 1990), Латвіі («Ліепая. Гарадскі матыў», 1963; «Куточак Ліепаі», 1963), Літвы («Куточак Палангі», 1963), колішняй ФРГ («Франкфурт-на-Майне», 1974)… На жаль, дадзеная экспазіцыя не дазваляе скласці ўяўленне пра тое, якім партрэтыстам быў Уладзімір Садзін. На выстаўцы прысутнічае толькі «Дзяўчына» (1984) з серыі «Па В'етнаме», але адна яна ўжо прымушае задумвацца пра тое, на што мастак быў здольны ў гэтым кірунку.

**Яўгенія ШЫЦЬКА**